Акрамя таго, кніга павінна лёгка чытацца, мець “многа паветра”.

Прыватныя выдавецтвы, чыя прадукцыя запаланіла кніжныя прылаўкі, значна ўступаюць ва ўзроўні мастацкага афармлення дзяржаўным. У большасці з іх працуюць мастакі, якія не з'яўляюцца прафесіяналамі у сферы кнігі.

Самыя ўдалыя, на наш погляд, выданні апошняга часу — гэта “Песня пра зубра” М.Гусоўскага (мастак Ул.Савіч), “Тарас на Парнасе” (мастак У.Гладкевіч), “Журавель і чапля” М.Танка (мастак В.Славук), “Гарады Беларусі на старых паштоўках” В.Целеша (мастак А.Цароў), “Пан Тадэвуш” А.Міцкевіча (мастак В.Шаранговіч), а таксама “Нацыянальны дызайн-цэнтр”, “Іканапіс Беларусі XV—XVIII стст.”, “Веткаўскі музей народнай творчасці” і інш.

**С.Л.Бухель,**
*суіскальнік кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МЕТАДЫЧНЫХ ЦЭНТРАЎ ЯК СРОДАК ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ СФЕРЫ

*(на прыкладзе Магілёўскага АНМЦ)*

Рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць — адзін з напрамкаў работы навукова-метадычнага цэнтра (НМЦ).

Сёння гэты кірунак работы НМЦ найбольш актуальны, што вызначаецца глабальнай інфарматызацыяй і развіццём сучасных інфармацыйных тэхналогій, без якіх немагчыма нармальная прафесійная дзейнасць. Больш таго, у культурна-адпачынкавай сферы (КАС) інфармацыйная дзейнасць і творчая актыўнасць работнікаў культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйных работнікаў знаходзяцца ў непасрэднай залежнасці. Але, як ні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадаксальна, КАС сёння знаходзіцца ў стане "інфармацыйнага голаду", калі цэлыя кірункі дзейнасці, метадычныя, псіхалагічныя, педагагічныя аспекты, новыя з'явы і тэндэнцыі развіцця апынуліся за рамкамі інфармацыйнага забеспячэння.

У выніку разрыву інфармацыйных сувязей з Расіяй (а ўвесь паток і масіў галіновай літаратуры сканцэнтраваны менавіта там), павышэння цэн на перыядычныя выданні шмат з таго, што друкуецца, аказваецца недасягальным не толькі для сельскіх клубных работнікаў, але і метадыстаў раённых метадычных службаў. Толькі абласныя НМЦ могуць дазволіць сабе выпісаць больш ці менш поўны рэпертуар неабходных перыядычных выданняў, у тым ліку і з сумежных галін ведаў.

Яшчэ адна акалічнасць прымушае інтэнсіўна развіваць рэдакцыйна-выдавецкую дзейнасць. Гэта ўзмацненне інтэграцыйных працэсаў у культурнай, адукацыйнай і сацыяльнай сферах грамадскага жыцця, якія патрабуюць адэкватнай рэфлексіі, адпаведнага метадычнага забеспячэння.

Такім чынам, сёння выдавецкую дзейнасць метадычных цэнтраў трэба разглядаць як сродак існавання і самаразвіцця галіны.

На працягу апошніх васьмі— дзевяці гадоў Магілёўскі АНМЦ надае шмат увагі гэтай праблеме, аб чым сведчыць рэтраспектыўны бібліяграфічны паказальнік "Издания Могилевского ОНМЦ", у якім адлюстраваны выданні за 1990—1998 гг. (усяго каля 180 найменняў.) Выбар ніжняй граніцы храналагічнага ахопу абумоўлены тым, што сістэматычны бібліяграфічны ўлік выдаваемай літаратуры вядзецца з 1990 г.

Зараз большасць выданняў Магілёўскага АНМЦ выходзяць у шасці серыях: "Метадычныя дапаможнікі", "Сцэнарыі клубных мерапрыемстваў", "Рэпертуар мастацкай самадзейнасці", "З вопыту работы", "Бібліяграфія — культработніку", "Дакументы і матэрыялы". Акрамя гэтага, выдаюцца буклеты, нотныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зборнікі, а таксама абласны часопіс “Клуб і народная творчасць” (з 1993 г.).

Відавы склад выданняў прадстаўлены перыядычнымі, бібліяграфічнымі, метадычнымі, сцэнарнымі, рэпертуарнымі, нотнымі выданнямі і абагульненнямі вопыту работы*.

*Табліца 1*

| Віды выданняў | У тым ліку | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | перыядычныя | бібліяграфічныя | метадычныя | абагульненне вопыту | сцэнарныя | рэпертуарныя | нотныя |
| Самастойныя | 29 (16,2 %) | 15 (8,4 %) | 23 (13 %) | 34 (19,4 %) | 60 (33,5 %) | 4 (2,2 %) | 14 (7,8 %) |
| Публікацыі ў выданнях | — | 1 | 14 | 6 | 37 | 1 | 12 |

Як бачна з табл. 1, найбольшы працэнт выданняў прыпадае на сцэнарную літаратуру (33,5 %) і абагульненні вопыту работы (19,4 %), і гэта абгрунтавана. Сцэнарый — інфармацыйная база асноўнага прадукту КАС — культурна-адпачынкавага мерапрыемства, у якім акумулююцца ўсе аспекты творчай дзейнасці культурна-адпачынкавых устаноў. Менавіта ў патоку сцэнарных распрацовак адлюстроўваецца актуальны змест КАС. Так, для перыяду 1990—1998 гг. характэрны паток сцэнарных распрацовак па народнай святочна-абрадавай культуры (адпаведна выдадзена 32 найменні: 22 самастойныя выданні і 10 публікацый у выданні). У той жа час сталі актуальнымі гульнявыя, конкурсныя і дыскатэчныя праграмы (выдадзена 14 зборнікаў).

Са сцэнарных распрацовак Магілёўскага АНМЦ можна адзначыць серыю “Жывая спадчына” (11 выпускаў), арыгінальныя аўтарскія работы: зборнік

* Для статыстычнага аналізу масіву выданняў абласнога навукова-метадычнага цэнтра выкарыстаны азначэнні “самастойнае выданне” і “публікацыі ў выданні”.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

гульнявых праграм "Як на святцы разгуляцца", сцэнарый вячорак "К суседу на бяседу", сцэнарыі вясельных абрадаў "Заручыны" і "Пойдзем, мая любая, да шлюбу", сцэнарый "Свята бульбы", сцэнарый тэатралізаванага вечара, прысвечанага Дню беларускага пісьменства і друку "Зямля пад белымі крыламі" і інш.

Абагульненне вопыту работы культурна-адпачынкавых установ мае вялікае значэнне для папаўнення ведаў работнікаў сферы вольнага часу і рэкрэацыйных работнікаў. У інфармацыйным забеспячэнні КАС гэтыя выданні маюць вялікую ролю, таму што фундаментальныя міжгаліновыя распрацоўкі па тэорыі, методыцы і практыцы культурна-адпачынкавай дзейнасці амаль адсутнічаюць. Метадычныя веды ў інфармацыйным полі КАС застаюцца асабістым вопытам работнікаў культурна-адпачынкавай сферы. Калі вопыту не надаць дакументальную аснову, яго немагчыма ўвесці ў сістэму інфармацыйнага і метадычнага забеспячэння галіны. Вывучэнне і абагульненне вопыту работы, асабліва творчага, — працэс дастаткова складаны і не заўсёды паддаецца ідэнтыфікацыі. Таму многія выданні серыі "З вопыту работы" маюць апісальны, інфармацыйны характар і толькі сігналізуюць аб наяўнасці інавацыі ў дадзеным кірунку дзейнасці.

Калі разглядаць суадносіны выданняў па асноўных кірунках КАС, то гэта выглядае наступным чынам (у суме метадычных дапаможнікаў і выданняў па абагульненні вопыту работы).

*Табліца 2*

| Віды выданняў | У тым ліку | | |
|---|---|---|---|
| | культурна-адпачынкавая сфера | народная сфератворчасці | клубы і аматарскія аб'яднанні |
| Самастойныя | 15 (8,4 %) | 33 (18,2 %) | 9 (5 %) |
| Публікацыі ў выданнях | 14 | 29 | 5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйна мастацкая самадзейнасць лепш забяспечана выдавецкімі прадуктамі. Для КАС 8,4 % — значэнне вельмі нізкае, на што паказалі і 30 % апытаных. На пытанне анкеты: "Вашы пажаданні метадычнай службе" — яны адказалі: "Выдавайце больш метадычнай літаратуры, распрацовак па формах работы". Трэба прызнаць, што ў гэтым плане КАС адстае ад бібліятэчнай справы, дзе пошук, апрабацыя і ўкараненне інавацый ідуць даволі інтэнсіўна.

У пэўнай ступені недахоп метадычных дапаможнікаў могуць запоўніць бібліяграфічныя выданні, дзе мадэлюецца той ці іншы кірунак работы, адлюстроўваюцца новыя з'явы і тэндэнцыі. Асабліва гэта неабходна ў тых выпадках, калі адсутнічаюць абагульняючыя распрацоўкі па актуальных кірунках КАС, а наяўны паток літаратуры прадстаўлены разрозненымі публікацыямі ў шматлікіх часопісах (у тым ліку з сумежных галін ведаў). Бібліяграфічны дапаможнік, у якім акумуліруюцца і структурыруюцца паток і масіў галіновых публікацый, потым актыўна выкарыстоўваецца работнікамі культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйнымі работнікамі пры арганізацыі і планаванні працы, у метадычным і практычным засваенні новых або рэканструяваных формаў і кірункаў КАС. Пацвярджэннем гэтаму могуць служыць методыка-бібліяграфічныя дапаможнікі "Клуб и семья" (Магілёў, 1993) і "Прырода просіць паратунку" (Магілёў, 1993), бягучы рэфератыўна-бібліяграфічны паказальнік "Новая літаратура па сацыякультурнай і адпачынкавай дзейнасці". Апошні адлюстроўвае бягучыя паступленні ў фонд бібліятэкі Магілёўскага АНМЦ; змест крыніц раскрываецца ў пашыраных анатацыях і рэфератах, што робіць галіновую літаратуру больш даступнай для карыстальніка.

Што тычыцца асобных жанраў мастацкай самадзейнасці, то тут у прывілеяваным стане апынуўся музычны жанр. З 33 выданняў 22 прыпадае на самадзейную музычную творчасць. Гэта тлумачыцца і наяўнасцю ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АНМЦ адпаведных спецыялістаў, і большай пашыранасцю жанру ў параўнанні з іншымі.

Нотныя выданні ў патоку выдавецкіх прадуктаў АНМЦ з'явіліся ў 1993 г. Усяго выдадзена 14 зборнікаў, з іх 7 зборнікаў фальклору і 7 зборнікаў самадзейных кампазітараў Магілёўшчыны (у тым ліку 5 персанальных). Зборнікі фальклору — вынік штогадовых фальклорных экспедыцый і трывалага супрацоўніцтва спецыялістаў АНМЦ з выкладчыкамі музычнага вучылішча і педагагічнага універсітэта — прафесійнымі збіральнікамі фальклору.

Дарэчы, усяго пазаштатнымі аўтарамі (не ўлічваючы самадзейных кампазітараў) падрыхтавана і выдадзена 12 дапаможнікаў (або 6 %). Пошук таленавітых аўтараў — шлях да павышэння якасці выданняў АНМЦ, насычэння іх новым зместам. Але тут ёсць праблема матэрыяльнага заахвочвання гэтай дзейнасці.

Іншыя кірункі ўдасканалення выдавецкай дзейнасці метадычных цэнтраў бачацца ў наступным:

— у маніторынгу выдавецкай дзейнасці АНМЦ і інфармацыйных паводзін работнікаў культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйных работнікаў;

— ва ўкараненні новых інфармацыйных тэхналогій у рэдакцыйна-выдавецкія працэсы, што дазволіць значна палепшыць паліграфічнае афармленне выданняў, скараціць тэрміны іх выхаду і знізіць сабекошт, павялічыць тыраж, каб забяспечыць імі кожную клубную установу. Патрэба ў гэтым ёсць, аб чым сведчаць адказы на пытанне анкеты: "Якім крыніцам інфармацыі Вы аддаеце перавагу?" Толькі 50 % апытаных назвалі выданні АНМЦ, а для астатніх гэтыя выданні ў большасці сваёй з'яўляюцца недасягальнымі;

— у вырашэнні арганізацыйных пытанняў — адзінае планаванне выдавецкай дзейнасці абласных навукова-метадычных цэнтраў рэспублікі і выданне штогадовага зводнага бібліяграфічнага паказальніка літаратуры;

— ва ўвядзенні ў вучэбныя праграмы ВНУ, якія

рыхтуюць работнікаў культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйных работнікаў, спецкурсаў па методыцы падрыхтоўкі метадычных, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і матэрыялаў па абагульненні вопыту работы;

— у стварэнні рэспубліканскай карпаратыўнай аўтаматызаванай сеткі, якая б аб'ядноўвала АНМЦ рэспублікі.

**Ю.М.Бяспалы,**
*суіскальнік кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*

## РОЛЯ МЕТАДАЎ У НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Важным для кожнага даследчыка з'яўляецца вызначэнне галоўнага кірунку даследавання. У навуковай літаратуры шмат увагі надаецца значэнню метадалогіі і метадаў у даследаванні. Але не ўсе метады разглядаюцца з належнай увагай. Некаторыя навукоўцы лічаць, што "галоўнай мэтай метадалогіі навукі з'яўляецца вывучэнне тых сродкаў, метадаў і прыёмаў даследавання, з дапамогай якіх дасягаюцца новыя веды" (5, с. 14). Адносна такога выказвання можна заўважыць, што даследчыка павінен цікавіць не толькі канчатковы вынік, але і сутнасць яго дасягнення. Спецыфіка і характар пазнавальнай дзейнасці прадугледжваюць вывучэнне станаўлення, функцыянавання, суіснавання і ўзаемадзеяння эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў з мэтай найбольш поўнага і аб'ектыўнага раскрыцця тэмы.

Як вядома, у савецкі перыяд краевугольным каменем кожнай працы ў галіне гуманітарных навук прызнавалася марксісцка-ленінская тэорыя. А.М.Гульпе, напрыклад, пісаў аб гэтым дастаткова выразна: «Работа У.І.Леніна "Дзяржава і рэвалюцыя" самым карэнным чынам паўплывала на ўвесь ход успрымання юрыдычнай навукай марксісцка-ленінскай канцэпцыі як дзяржавы, так і права» (3, с. 13).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ